# «БЕЛАРУСЬ ГАТОВА АКАЗАЦЬ ДАДАТКОВУЮ ДАПАМОГУ РАСІІ Ў БАРАЦЬБЕ З ПАЖАРАМІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён адзначыў, што, нягледзячы на скарачэнне валавога збору збожжа, хлеба ў краіне хопіць, да таго ж ёсць пэўныя запасы.

«Мы вытрымаем гэты націск, і, калі якія-небудзь рэзервы будуць, мы вам абавязкова дапаможам з улікам нашых асаблівых адносінаў. Мы б хацелі, каб вы, наша Расія, ведалі, што мы ніколі ўбаку не застанёмся», — падкрэсліў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ў выпадку неабходнасці беларускі бок гатовы вызваліць сілы заходняй часткі, сфарміраваць і накіраваць новыя атрады. Ён таксама нагадаў, што ў краіне ёсць пэўны вопыт барацьбы з тарфянымі пажарамі. Прэзідэнт даручыў прэм'ер-міністру Беларусі звязацца з губернатарам Маскоўскай вобласці і мэрам Масквы і прапанаваць, як дзейнічаць далей у існуючай сітуацыі. «Спяшацца цяпер нельга, трэба дзейнічаць асцярожна», — сказаў ён.

Кіраўнік беларускай дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў, што Беларусь гатова дапамагаць Расіі, апіраючыся на існуючы вопыт. «Будзем весці дыялог і старацца вам дапамагчы. Калі патрэбны нашы прадукты харчавання — калі ласка», — адзначыў ён.

У сваю чаргу Прэзідэнт Татарстана адзначыў, што засуха моцна ўдарыла і па гэтай рэспубліцы, прывёўшы да такой праблемы, як пажары. Ён расказаў, што ў гэтым годзе значна зменшыцца ўраджай збожжа. Ён таксама дадаў, што з беларускага боку ёсць поўнае разуменне. «Лічу, усе разам мы справімся», — адзначыў ён.

## Герасіменя заваявала еўрапейскае серабро

Першы медаль з'явіўся ў скарбонцы нашай зборнай на чэмпіянаце Еўропы па плаванні. «Серабро» на дыстанцыі 100 м вольным стылем заваявала Аляксандра Герасіменя. У фінале беларуска паказала вынік 53,82 секунды, абнавіўшы рэкорд Беларусі. Выйграла дыстанцыю 20-гадовая брытанка Франчэска Халзал (53,58), трэцяе месца заняла галандка Фемка Хеенскер (54,12).

**Алена КРАВЕЦ.**

## Дружыннікі выйдуць на пляжы

Выйдуць таксама дадатковыя нарады міліцыі і выратавальнікі. Такое распараджэнне выдадзена ўладамі Гомеля, каб хоць бы ў абласным цэнтры, дзе акрамя 5 афіцыйных пляжаў ёсць яшчэ каля 80 неафіцыйных, знізіць смяротнасць ад вады. У горадзе вызначаны самыя небяспечныя 15 месцаў стыхійнага адпачынку грамадзян, якія сёлета сумна адзначыліся тапельцамі. З пачатку года ў вадаёмах Гомельскай вобласці патанулі 150 чалавек, у тым ліку 14 дзяцей. Гэта амаль што на 60 % больш, чым летась за той жа перыяд.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Адкрыць у банку ўклад і... пабачыць Парыж!

**Наўрад ці жыхарка Слоніма Алена Пятроўская, адкрываючы паўтара года таму ў Белаграпрамбанку ўклад на імя сваёй дачкі Вікторыі, думала пра нейкія сюрпрызы. Аднак па волі лёсу і Фартуны менавіта ёй пашчасціла стаць пераможніцай рэкламнай гульні «Падары мару!»**

Яна праводзілася сёлета сярод укладчыкаў Белаграпрамбанка, удзельнікаў акцыі «Дзіцячая ашчадная праграма «Расці Вялікі!». Прызавым фондам гульні стала не толькі паездка на двух дарослых і адно дзіця ў Парыж (з наведваннем парку «Дыснэйленд Рэзот Парыж») коштам больш за 8,7 мільёна рублёў і грашовай часткай галоўнага прыза — 1,3 мільёна рублёў, але і 6 заахвочвальных прызоў. Спіс удзельнікаў склалі 10 219 дагавораў тэрміновага банкаўскага ўкладу, заключаных 8342 удзельнікамі гульні.

Апроч пераможніцы ўдача ўсміхнулася таксама мінчанцы Вользе Вішнеўскай з дачкой Маяй, жыхарцы Бярозы Ліліі Цюшкевіч з дачкой Янінай — яны выйгралі па лічбавай камеры. Мінчане Вольга Шырко, якая заключыла дагавор на дачку Кацярыну, і Вячаслаў Новік, які заключыў дагавор на ўнучку Валерыю, атрымалі ў якасці прызоў па MP3-плэеру. Жыхарка вёскі Цімкавічы Капыльскага раёна Галіна Пасюк і яе ўнучка Арына, а таксама Вольга Джурка з Гродна, якая заключыла дагавор на сына Андрэя, выйгралі па лічбавым фотаапараце.

Ва ўрачыстых абставінах намеснік старшыні праўлення ААТ «Белаграпрамбанк» Генадзь Сысоеў павіншаваў усіх уладальнікаў заахвочвальных прызоў. Пры гэтым ён зазначыў: «Гледзячы ў будучыню, банк бачыць сваіх кліентаў і сярод падрастаючага пакалення краіны. Спецыяльна для яго намі прынятая і рэалізуецца «Дзіцячая ашчадная праграма «Расці Вялікі!» Уручаючы кожны год дзецям, удзельнікам праграмы, падарункі да дня нараджэння і бачачы радасць у іх вачах, прыемна ўсведамляць, што мы не толькі ствараем яркія запамінальныя старонкі іх дзяцінства, але і росцім адданых кліентаў на перспектыву».

Нагадаем, што стаць удзельнікам акцыі «Дзіцячая ашчадная праграма «Расці Вялікі!» можа кожны, хто заключыў дагавор тэрміновага банкаўскага ўкладу сістэмы зберажэнняў «Лінія росту» на імя дзіцяці ў любым падраздзяленні Белаграпрамбанка. Сума ўкладу павінна складаць не менш за 1 мільён беларускіх рублёў, 500 долараў/еўра ці 1500 расійскіх рублёў, а тэрмін — не менш за 500 дзён.

Удзел у акцыі «Дзіцячая ашчадная праграма «Расці Вялікі!» дазваляе не толькі захаваць і павялічыць свае зберажэнні, але і адчыняе дадатковыя магчымасці — дзіця, на імя якога адкрыты ўклад, штогод, да дасягнення ім 16-гадовага ўзросту, будзе атрымліваць на свой дзень нараджэння падарунак ад банка, а асоба, што заключыла дагавор на ўмовах акцыі, мае права на атрыманне крэдытнай карткі на спецыяльных умовах. Акрамя таго, удзельнікі ашчаднай праграмы, на імя якіх адкрыты ўклад, дасягнуўшы адпаведнага ўзросту змогуць скарыстацца крэдытам «Студэнцкі» для аплаты сваёй адукацыі ў ВНУ.



Намеснік старшыні праўлення банка Генадзь СЫСОЕЎ з пераможцам і ўладальнікамі заахвочвальных прызоў рэкламнай гульні «Падары мару!».

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# ЯКОЕ ПЫТАННЕ, ТАКОЕ АДПАВЯДАННЕ

## Чыноўнікаў абавяжуць адказваць на беларускамоўныя запыты... па-беларуску

Дэпутатам зараз даводзіцца папацець, і не толькі з-за спёкі. У міжсесійны час, як вядома, — самая руплівая работа над законапраектамі. Каб увосень засталося хіба што націснуць «так» на маніторчыку. У графіку шостай сесіі ўжо «забраніраваныя» месцы для 32 законапраектаў. Нашу ўвагу прыцягнуў той, што прысвечаны зваротам грамадзян і юрыдычных асобаў. Ды і не толькі нашу: з розных інстанцый ужо выказана больш як 60 прапаноў. Сапраўдны мішэнню для заўваг стала палажэнне аб зваротах па электроннай пошце — больш за ўсё спрэчак менавіта вакол іх.

— Калі пакідаць гэту форму, неабходна, каб электронныя звароты паступалі на афіцыйныя сайты арганізацый, — мяркуе **Яўген МЕЛЬНІКАЎ, дэпутат Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ**, — каб не проста ўсім, хто працуе ў ведамстве, пачалі пісаць, і ў выніку было практычна немагчыма даць адказы кожнаму. Таму прадугледжваецца, каб гэта было на афіцыйныя сайты арганізацыі, і адпаведна асобы, якія адказваюць за паступленне зваротаў, будуць іх рэгістраваць і адказваць. Ёсць яшчэ адзін момант: у нас жа існуюць пэўныя патрабаванні да ўсіх зваротаў, а ў электронным варыянце атрымліваецца, што зварот ідзе без подпісу... Выказваюцца меркаванні наогул супраць узаконьвання такіх зваротаў. Хоць пэўная практыка ў краіне, у прыватнасці ў Мінску, ёсць — у многіх арганізацыях карыстаюцца гэтым. Аднак узнікае пытанне, якім чынам адказваць на такія звароты — пісьмова ці праз інтэрнэт...

Здзіўляе, што заканадаўчае замацаванне статусу электронных зваротаў ні на колькі не скароціць тэрмін іх разгляду, хоць паведамленні праз інтэрнэт дасылаюцца імгненна.

— Было шмат дыскусій наконт **тэрмінаў** для адказу. І грамадзяне нам дасылалі лісты наконт праекта закона, і ад СМІ паступаюць звароты... Мы ўсё ж вырашылі, што тэрміны павінны быць адзіныя — існыя ў законе.

На разгляд пісьмовых зваротаў, нагадаем, даецца 15 дзён. А ў выпадку, калі патрабуецца дадатковая праверка — да месяца.

— Ёсць яшчэ адзін момант па пераадрасаванні зваротаў — калі пытанні, якія там уздымаюцца, не адносяцца да кампетэнцыі той арганізацыі, куды паступілі, — адзначае палітык. — Праект закона прапісвае, у які тэрмін звароты адпраўляюцца ў іншую інстанцыю, і абавязвае паведамляць пра гэта заяўніку на працягу пяці дзён (як і ў выпадку, калі зварот пакідаюць без адказу) — каб ён ведаў лёс свайго звароту.

Паклапаціліся пра заяўнікаў і тады, калі абавязалі ўстановы тлумачыць прычыны адмовы ад разгляду скаргі:

— Многія арганізацыі ў сваіх адказах робяць такую спасылку: «у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам». Мы на рабочай групе гэта разглядалі, і ўсё ж вызначылі па-іншаму. Калі ўжо спасылаюцца на заканадаўства, павінна быць дакладна растлумачана, на падставе чаго, — сцвярджае народны абраннік, і мае рацыю. — Заяўнік павінен ведаць, на падставе якога нарматыўнага акта, якога артыкула яму адмоўлена,— каб ён пасля не думаў і не шукаў...

У праекце закона дакладна пералічаныя ўсе выпадкі, у якіх зварот можа быць пакінуты без разгляду. А таксама ўсталёўваюцца новыя правілы для разгляду калектыўных скаргаў: калі са сваёй праблемай звяртаюцца разам 30 і больш чалавек — зварот абавязкова будуць разглядаць з выездам на месца.

— Так можна больш аб'ектыўна высветліць сітуацыю, — адзначае дэпутат.

Аднак асабіста для нас самае ўцешнае новаўвядзенне — адносна мовы перапіскі:

— На рабочай групе яшчэ абмяркоўвалася, на якой **мове** даваць адказ. У нас у краіне дзве дзяржаўныя мовы, — нагадвае народны абраннік, — і мы ўсё ж прыйшлі да такога меркавання, і будзем яго прытрымлівацца, — даваць адказ на мове звароту. Калі ён на беларускай мове, значыць, адпаведна адказваць па-беларуску, калі на рускай — значыць па-руску.

Законапраект дае грамадзянам і юрыдычным асобам новую магчымасць — звяртацца да індывідуальных прадпрымальнікаў. Аднак адносна гэтай нормы таксама вядуцца бурныя дыскусіі:

— Асобная катэгорыя настойвае на тым, каб індывідуальных прадпрымальнікаў прыраўнаваць да арганізацый і ўстаноў (у плане работы са зваротамі. — **Аўт.**). Аднак на практыцы ёсць пэўныя цяжкасці. Бо што такое ІП? Гэта ўтварэнне, дзе працуе адзін, ну двое-тры чалавекі. І добра, калі яны займаюцца сваёй справай — пастаўкай нейкіх тавараў ці аказаннем паслуг. Калі ўзаконіць усе формы зваротаў да іх, абавязаць да вызначэння часоў прыёму, вядома ж, ім давядзецца вельмі нялёгка ды нерэальна гэта зрабіць! Таму мы гэта будзем выносіць на пасяджэнне камісіі, і, хутчэй за ўсё, пакінем у дачыненні да іх толькі пісьмовыя звароты, — падзяліўся з журналістамі напярэдадні пасяджэння дэпутат.

Раней незадаволенаму работай індывідуальнага прадпрымальніка можна было хіба толькі раз'юшана запісваць свае прэтэнзіі ў кнігу скаргаў і прапаноў, звяртацца ў арганізацыі па абароне спажыўцоў, падаваць у суд. Такіх магчымасцяў, натуральна, ніхто не адмяняе і сёння. Аднак у дадатак цяпер можна пісьмова звярнуцца да прадпрымальніка, які ў адпаведнасці з законам абавязаны будзе адказаць на пісьмовы зварот. «Аднак звычайна прэтэнзіі вырашаюцца на месцы», — кажа народны абраннік.

Спрачаюцца і наконт таго, якія звесткі павінны быць у звароце.

— Мне асабіста, як практыку, зручней, калі пазначана прозвішча, імя, імя па бацьку грамадзяніна, пажадана і хатні тэлефон, мабільны — пры яго наяўнасці, — дзеліцца з намі спадар Мельнікаў. — Аднак падчас абмеркавання сышліся толькі на прозвішчы, імя, імя па бацьку або ініцыялах. Хоць з ініцыяламі, шчыра кажучы, нязручна працаваць: падчас высвятлення справы нярэдка ўзнікае неабходнасць звярнуцца да чалавека. Не будзеш жа пісаць «Пятрову І.І.». Ды і наогул, таму, хто атрымлівае адказ, больш прыемна, калі да яго звяртаюцца па імені...

Ініцыялы — яшчэ паўбяды, а што рабіць з ананімнымі зваротамі? Або падпісанымі якім Пупкіным, а на праверку...

— На практыцы нярэдка атрымліваецца, што прозвішча-імя нібыта і названыя, ды працоўны адрас ёсць, а калі пачынаем разбірацца, высвятляецца, што няма такога супрацоўніка... Розныя тут пункты гледжання былі, вось і ў сувязі з увядзеннем электроннага звароту таксама — аб абавязковым разглядзе ці паводле меркавання кіраўніка. Улічваючы, што ў нас такая норма ўводзіцца ўпершыню і будуць пэўныя цяжкасці, то пакуль захоўваецца палажэнне, якое мы будзем абмяркоўваць, — «на меркаванне кіраўніка». І ён жа будзе вырашаць, у якім выглядзе даваць адказ (па звычайнай пошце ці па электроннай. — **Аўт**.). Каб не заганяць у кут... Ну а пасля жыццё пакажа, у закон могуць уносіцца папраўкі.

Пакуль жа профільная камісія рыхтуе дакумент да першага чытання.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Абзац

◢ **У Беларусі агракліматычныя зоны ў выніку змянення клімату зрушыліся на 60—150 км.** Паўночная агракліматычная зона знікла, а на поўдні Палесся ўтварылася новая, больш цёплая, якая характарызуецца самай кароткай і цёплай у межах Беларусі зімой і найбольш працяглым вегетацыйным перыядам.

◢ **Колькасць насельніцтва Беларусі на 1 ліпеня гэтага года склала 9469,2 тыс. чалавек. У параўнанні з 1 студзеня гэтага года жыхароў краіны стала менш на 11 тыс. чалавек. Скарачэнне колькасці насельніцтва абумоўлена перавышэннем на 15746 чалавек колькасці памерлых над колькасцю народжаных пры станоўчым міграцыйным прыросце 4778 чалавек.**

◢ На рэках Беларусі назіраецца спад узроўню вады з сутачнай інтэнсіўнасцю да 8 см. Найбольш складаныя ўмовы на Заходняй Дзвіне на ўчастку Сураж—Віцебск і ў раёне горада Полацка, на рацэ Сож каля Гомеля, дзе ўзровень вады знаходзіцца ніжэй за небяспечную адзнаку. Гэта можа выклікаць ускладненні ў рабоце рачнога транспарту.

◢ **Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў селетнім чэрвені склала Br1 млн 234 тыс. 941. У маі гэты паказчык быў роўны Br1 млн 158 тыс. 373. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у чэрвені склала Br1 млн 254 тыс. 439 (у маі яна была Br1 млн 176 тыс. 361).**

◢ Спроба нелегальнага правозу партыі ў 20 тыс. пачкаў цыгарэт, паводле папярэдняй ацэнкі на суму каля Br30 млн, была спынена ў пункце пропуску «Каменны Лог». Пры аглядзе паўпрычэпа грузавога аўтамабіля «Вольва» былі знойдзены цыгарэты без акцызных марак Беларусі. Цыгарэты знаходзіліся ў спецыяльна выробленым тайніку, доступ да якога стаў магчымы толькі пасля дэмантажу двайной падлогі паўпрычэпа.

◢ **У Кардобу — адзін з буйных гарадоў Аргенціны — на доследную эксплуатацыю адправіўся тралейбус ААТ «Белкамунмаш». Ён зроблены спецыяльна для Аргенціны. Тралейбус можа абыходзіцца і без правадоў. Спецыяльны дызель-генератар дазволіць праехаць каля 200 км, не падключаючыся да кантактнай сеткі. Прадугледжана таксама дадатковая сістэма ахаладжэння. А каб беларускі тралейбус спадабаўся тэмпераментным аргенцінцам, яго пафарбавалі ў ярка-чырвоны колер.**

◢ У Індыі знойдзены новы тып мікроба, які ўстойлівы да ўсіх існуючых антыбіётыкаў, у тым ліку самых моцных. Новая бактэрыя, якая атрымала назву «Нью-Дэлі метала-бета-лактамаза-2! (NDM-1), была знойдзена ў 50 пацыентаў у Вялікабрытаніі. Прычым 37 з іх вярнуліся з Індыі, Пакістана і Бангладэш. Таксама NDM-1 была знойдзена не менш чым у 60 хворых у клініках гарадоў індыйскіх штатаў Тамілнад і Хар'яна. На думку медыкаў, новы супермікроб можа спарадзіць смяротныя інфекцыі, што ўяўляюць пагрозу здароўю ўсяго чалавецтва.

◢ **Загадчыца мінскага дзіцячага садка падазраецца ў хабарніцтве. Жанчына 1971 года нараджэння ўзяла ў аднаго з бацькоў 500 долараў за станоўчае вырашэнне пытання аб уладкаванні дзіцяці ў яслі-садок.**

## Поўны абзац

◢ Пераможца юнацкага конкурсу прыгажосці «Міс Уонгануі» Алівія О'Ніл пазбавілася свайго тытула пасля таго, як змяніла колер валасоў. 15-гадовая жыхарка Новай Зеландыі атрымала карону, калі была бландзінкай, а праз некалькі месяцаў пасля перамогі яна перафарбавалася і стала брунеткай, што не спадабалася аргкамітэту.

◢ **Жыхар аднаго з сёлаў Паўночна-Казахстанскай вобласці прыгразіў падаць у суд на суседку, якая назвала яго «лысым мужчынам страшнага выгляду». Пакрыўджаны казахстанец запатрабаваў кампенсацыю ў 500 тысяч тэнге і даў жанчыне дзесяць дзён на роздум. Па заканчэнні гэтага тэрміну будзе накіраваны іск у суд.**

◢ Жыхар эстонскага сяла Леэнэ, уджалены пчоламі, прыстрашыў падаць у суд на мясцовага пчалавода. Пры гэтым мужчына не патрабуе кампенсацыі, а спрабуе дабіцца змены маршруту, па якім лятаюць пчолы. Па словах пчалавода, патрабаванні пацярпелага яму незразумелыя.

◢ **У крамах Уфы ў продажы з'явілася каўбаса, назва якой з башкірскай перакладаецца як «Вараныя дзеці». На ўпакоўцы каўбасы выява дзіцяці ў падгузку, якое есць сасіску. У сапраўднасці мясакамбінат, які выпускае каўбасу «Вараныя дзеці», хацеў паведаміць спажыўцам, што прадукт прызначаны для малых, аднак дапусціў памылку ў напісанні яго назвы. Той, хто ведае башкірскую мову, такой прыкрай памылкі дапусціць не мог. Хутчэй за ўсё, фразу даслоўна пераклалі са слоўнікам з рускай мовы.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Нічога асабістага!

# ЖЫЦЦЁ ЗЛЕВА

**— О! Ты ляўшун? — звычайна са здзіўленнем пытаюць людзі, калі бачаць, як я бяру асадку ў левую руку і пачынаю нешта крэмзаць у нататніку. Ну і, як правіла, потым ці глядзяць, як на цуд свету, ці дадаюць: — «А ў мяне пляменнік/унучка/сусед/муж сястры таксама ляўшун!» — відаць, каб я сябе не адчуваў адзінокім у гэтым праварукім свеце.**



Сёння ў такіх леварукіх прафесійнае свята — Міжнародны дзень леўшуна. Як пішацца ў разумнай Вікіпедыі, па статыстыцы, кожны дзясяты на нашай планеце з'яўляецца леўшуноў і можа прымаць віншаванні ў гэты дзень. Там жа напісана, што мэта гэтага свята — «звярнуць увагу вытворцаў рознага абсталявання на праблемы леўшуноў: пры працы на абсталяванні для праўшоў леўшуны здзяйсняюць ненатуральныя для іх рухі, у выніку чаго часцей атрымліваць нервовы і мышачны стрэс».

От жа завярнулі! Атрымліваецца, што я жыву ў пастаянным стрэсе! Не ведаю як хто, але пра тое, што я ляўшун, узгадваю толькі тады, калі мне пра гэта кажуць іншыя людзі: убачаць, што футбольны мячык б'ю левай нагой і зноў пачынаецца: «О! Ты ляўшун?». А я неяк і не разважаў якой нагой біць, якой рукой лыжку браць і адчыняць дзверы.

Цікава, што ў школе мяне перавучваць пісаць правай рукой не сталі. Бо была вельмі добрая і разумная першая настаўніца — яна сказала: «Не трэба перавучваць, хай піша як піша». Ну я і крэмзаў кручкі ды палачкі левай рукой. Безумоўна, мазаў чарнілы рукой услед толькі што напісанае, але ж шарыкавай асадкай пісаць — гэта ж не пяром. І пасадзілі мяне за парту з дзяўчынкай-леўшуном, каб адзін аднаму локцямі не заміналі.

Мама мне расказвала, што я, калі быў зусім малы, то цацкі пачаў браць адразу левай рукой. Мне іх даюць у правую — а я ў левую перакладваю. Дзіцячы тэрапеўт мне даў аловак у правую руку і кажа: «Вось, трымай у правай руцэ, ёй маляваць трэба». А я не разгубіўся — трошкі падумаў і запярэчыў: «Не-е, вось гэта правая!» — і ўзяў аловак левай рукой.

Ну і зусім анекдатычная гісторыя адбылася ў маёй цёткі з яе мужам. Селі яны неяк бульбу стругаць, і тут мая цётка свайму мужу і кажа: «Слухай, а чаго ты нож у левай руцэ трымаеш? Ты што, таксама ляўшун?». От так колькі гадоў жылі разам, а не ведалі, што абодва — леўшуны! У прынцыпе — гэта і не дзіўна. Я, напрыклад, не заўважаю, хто побач са мной — ляўшун ці праўшун. А вось мяне праўшуны, наадварот, заўважаюць.

Зараз падумаў, што я нідзе ў Беларусі не бачыў спецыяльнай крамы з таварамі для леўшуноў. І не бачыў, каб наша прамысловасць выпускала нешта спецыяльна для прыкладна адной дзясятай часткі насельніцтва. Не скажу, што я ад гэтага пакутую, але ў спецыялізаваную краму для леўшуноў завітаў бы: можа і, праўда б, прыкупіў што карыснае. Затое ў мяне ёсць адна перавага — адзначаць на адно свята болей. Бо Міжнародны дзень леўшуна ёсць, а праўшуна — няма!

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

**Пряльницкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 3 (Трех) земельных участков индивидуального жилищного строительства в следующих населенных пунктах:**

**Лот 3** — земельный участок № 3 в деревне Галимцы, площадь участка — 0,2493 га, кадастровый номер 622084602601000103, начальная цена 2 000 000 белорусских рублей;

**Лот 4** — земельный участок № 4 в деревне Галимцы, площадь участка — 0,2477 га, кадастровый номер 622084602601000104, начальная цена 2 000 000 белорусских рублей;

**Лот 5** — земельный участок № 5 в деревне Галимцы, площадь участка — 0,2487 га, кадастровый номер 622084602601000105, начальная цена 2 000 000 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 17 сентября 2010 года в 14.00.**

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненных к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Победитель аукциона обязан: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечислить на расчетный счет № 3600614130508 в ЦБУ № 605 г. Воложина филиала № 500 МОУ АСБ «Беларусбанк», код банка 601, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, назначение платежа 04901, УНП 600059273, Пряльницкий сельский исполнительный комитет.

**Аукционы состоятся 17 сентября 2010 года в 11.00 по адресу: деревня Пряльники, ул. Молодежная, дом 3, помещение Пряльницкого сельисполкома. Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 16.09.2010 года до 17.00, начала аукциона по адресу: д. Пряльники, ул. Молодежная, 3, кабинет управляющего делами.**

**Контактный телефон (8 01772) 31236, сайт в интернете: volozhin.gov.by**

## За лясамі назіраюць круглыя суткі

**Работнікі лясной гаспадаркі Магілёўскай вобласці перайшлі на кругласутачны рэжым працы, з прычыны спёкі і засухі, высокай пажаранебяспечнай сітуацыі.**

Паводле прагнозаў сіноптыкаў, тэмпература паветра на ўсходзе Беларусі можа дасягнуць 39 градусаў цяпла. Надзвычайны клас пажарнай небяспекі прагназуецца ў памежных з Расіяй Касцюковіцкім і Мсціслаўскім раёнах.

— Мы атрымалі папярэджанне аб надзвычайнай сітуацыі, — пацвердзіў начальнік аддзела аховы і абароны лесу Магілёўскага абласнога лесагаспадарчага аб'яднання Генадзь Францікаў. — Гатовы да ўсяго, аднак пакуль сітуацыя спакойная. 11 жніўня было зарэгістравана толькі адно ўзгаранне ў Магілёўскім раёне на трох сотках лесу. А 12 жніўня да канца працоўнага дня ўсё яшчэ спакойна.

Паводле афіцыйнай інфармацыі, з пачатку пажаранебяспечнага перыяду адбылося 105 пажараў, у якіх пацярпела больш за 120 гектараў лесу.

**Ілона ІВАНОВА.**

**За мінулыя суткі ў Беларусі ліквідавана 14 пажараў.**

# «СЫРАВІНА Ў НАС СВАЯ І АМАЛЬ БЯСПЛАТНАЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ліст чытача мы накіравалі ў Беларускі дзяржаўны канцэрн па вытворчасці і рэалізацыі фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прадукцыі (далей — канцэрн «Белбіяфарм»), які вядзе палітыку дзяржаўнага кіравання ў сферы фармацэўтычнай прамысловасці ў Рэспубліцы Беларусь. На наш запыт прыйшоў змястоўны адказ, у якім, з аднаго боку, падрабязна распавядаецца пра сітуацыю з імпартазамяшчэннем увогуле, з іншага, аналізуюцца канкрэтныя прапановы чытача.

### Эканомія для бюджэту краіны...

«Прадпрыемствы, што ўваходзяць у склад канцэрна «Белбіяфарм», штогод павялічваюць асартымент прэпаратаў, якія вырабляюцца, удзельнічаючы ў Галіновай праграме імпартазамяшчэння і Дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграме і шэрагу іншых.

У выніку рэалізацыі Дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы «Новыя лекавыя сродкі» за перыяд 2006—2009 гг. распрацаваныя і атрымалі ўкараненне ў прамысловую вытворчасць 17 аналагаў дарагіх і высокаэфектыўных лекавых сродкаў («Флударабел», «Метатрэскат», «Паклітаксел», «Трапісетрон», «Аміядарон» і інш). Цяпер на розных стадыях распрацоўкі і ўкаранення знаходзяцца 10 джэнерычных прэпаратаў рознага дзеяння, эквівалентных па тэрапеўтычнай актыўнасці замежным аналагам «Лізінапрыл», «Амаксіклаў», «Форвакс», «Варфарын» і інш. За перыяд 2006—2009 гг. кошт выпушчанай прадукцыі па праграме «Новыя лекавыя сродкі» склаў больш за 7,5 мільёна долараў ЗША. Эканомія валюты ад імпартазамяшчэння за гэты перыяд — 8,1 мільёна долараў ЗША. У рамках Галіновай праграмы імпартазамяшчэння 2006—2010 гг. засвоена ў вытворчасці 57 найменняў лекавых сродкаў. На ўнутраны рынак за 2006—2009 гг. прадпрыемствамі канцэрна пастаўлена імпартазамяшчальнай прадукцыі, распрацаванай у рамках праграмы, на суму 38,37 мільёна долараў ЗША.

Рэалізацыя праектаў па распрацоўцы і засваенні вытворчасці новых лекавых прэпаратаў у рамках праграмы імпартазамяшчэння дазволіла дабіцца значнага зніжэння імпарту па аналагічных замежных прэпаратах і, як вынік, эканоміі валютных сродкаў, якая склала 31,33 мільёна долараў ЗША, што ўтрая больш да першапачаткова запланаванага на 2006—2010 гг».

### ...і для кішэні насельніцтва

«Айчынныя аналагі імпартных прэпаратаў, што прайшлі ўкараненне ў вытворчасць, значна адрозніваюцца па цэнах , што дазваляе эканоміць сродкі бюджэту і насельніцтва. У выніку працы па штогадовым нарошчванні наменклатуры па выніках 2009 года доля айчыннай прадукцыі на рынку лекавых сродкаў склала каля 20 працэнтаў у цэнасным выражэнні і 55 працэнтаў — у натуральным, г.зн. больш чым кожная другая ўпакоўка лекавага сродку, што паступіла на рынак краіны — айчыннай вытворчасці.

Штогод у канцэрне і на прадпрыемствах спецыялісты праводзяць аналіз асартыменту лекавых сродкаў, што выпускаюцца, і вызначаюць максімальны асартымент прэпаратаў з розным спектрам дзеяння. Прыярытэтным кірункам развіцця фармацэўтычнай галіны з'яўляецца насычэнне рынку сучаснымі лекавымі прэпаратамі».

### Вырабляем тое, чаму няма аналагаў

«Лекавы сродак «Халасас» не адносіцца да сучасных высокаэфектыўных лекавых сродкаў, не ўваходзіць у Пералік асноўных лекавых сродкаў, які зацверджаны пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Аб'ём увозу імпартнага лекавага сродку невялікі. Разам з тым, выдаткі на распрацоўку тэхналогіі вытворчасці, падрыхтоўку вытворчых плошчаў, закупку абсталявання вялікія і будуць эканамічна немэтазгоднымі пры невялікім аб'ёме рэалізацыі.

Асартымент мазяў, што выпускаюцца прадпрыемствамі канцэрна, за апошнія пяць гадоў павялічыўся на 10 працэнтаў, пры гэтым акцэнт зроблены на вытворчасць мазяў, што не маюць анагалічных паказанняў па выкарыстанні сярод іншых лекавых формаў. Шкіпінарная мазь у тубах па 15 г і 25 г не выпрацоўваецца прадпрыемствамі канцэрна з 2006 года ў сувязі з вялікім асартыментам іншых мазяў. Але мы не пазбаўляем нашых спажыўцоў лекавага сродку на аснове шкіпінару і выпускаем для рынку краіны «Тэрпенавае масла» ў флаконах па 25 мл, якое ўтрымлівае такое ж дзеючае рэчыва, валодае аналагічным спектрам дзеяння, але больш эфектыўна пранікае праз слаі эпідэрмісу і хутчэй аказвае тэрапеўтычны эфект».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Наша Праўда

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак калі з паходжаннем першапачатковай назвы вялікіх пытанняў няма, то зразумець логіку змены назвы ўжо складаней. Магчыма, прычына ў тым, што «птушыны дыялектызм» проста падаўся некаму «немілагучным», але таксама не выключана, што вырашальнай аказалася наша завядзёнка рабіць усё «за кампанію». Так, у 1964 годзе бліжэйшая адсюль вёска Паненская Драхча ў гонар знакамітага палкаводца стала цалкам «правільнай» Кутузаўкай. І тады ж Буглацкая Драхча ў гонар галоўнай савецкай газеты ператварылася ў Праўду. А, адпаведна, як жыхары — у праўдзінцаў.

— Хтосьці са старых людзей сапраўды шкадаваў і колькі жыў — працягваў лічыць вёску Драхчай, — узгадвае адна са старэйшых жыхарак Праўды, 83-гадовая Марыя Мікалаеўна Акуліч. — А што ж да маладых, то яны прызвычаіліся хутка. Новая назва прыжылася, і, можа, цяпер старую ўжо нават мала хто ведае.

### ПАДАТКІ... НА ЎСЕ ВЫПАДКІ

Адшукаць якія-небудзь цікавыя помнікі архітэктуры тут не атрымаецца пры ўсім жаданні. У вёсцы Праўда не было нават царквы, так што даводзілася або ездзіць у Чэрвень, або хадзіць за тры кіламетры ў суседнюю Вішанку да старавераў. Прычым у апошнім выпадку не заставалася нічога, як прымаць пэўныя «правілы гульні». У царкву стараверы пускалі, але забаранялі... піць са сваіх кубкаў. З даволі цікавым тлумачэннем — «многія мужчыны кураць тытунь».

Зрэшты, вось дакладны гістарычны факт: напрыканцы пазамінулага стагоддзя цяперашняя Праўда мела «ўласную» карчму і краму, а ў 1914 годзе тут адчынілі земскую народную вучэльню. І зусім не выпадкова, бо людзей жыло шмат, яшчэ да Вялікай Айчыннай, заўважае Марыя Акуліч, у вёсцы налічвалася пад 120 дамоў. І ў кожным з іх — па 4-5, а то і па 8 дзяцей. Аднак менавіта той час быў ці не найбольш цяжкім.

— У 1940 годзе памёр мой бацька, а неўзабаве пачалася вайна, — распавядае Марыя Акуліч. — Маці была сувязной у партызанаў, і так здарылася, што на яе нехта заявіў. Прыехалі немцы, але паколькі маці дома не знайшлі, то забралі мяне і пасадзілі ў Чэрвені ў турму. А там нагледзелася на ўсё. Пэўна, таму цяпер я не магу нават чуць слова «паліцыя». Паліцаі былі горшыя за немцаў, памятаю, як яны «забаўляліся» ў турме: у прамым сэнсе сцягвалі чалавека па лесвіцы з трэцяга паверха і ў гэты час білі яго палкамі, ды так, што ад тых палак амаль нічога не заставалася. А потым мяне, як адну з самых малодшых, прымушалі змываць кроў.

Пасля двух месяцаў у турме было прынятае рашэнне аб вывазе на прымусовыя работы ў Германію. І тут ёй пашанцавала — пад Баранавічамі атрымалася ўцячы з цягніка. А потым са шматлікімі прыгодамі і дабрацца да партызанаў.

У нечым пашанцавала і вёсцы. Падчас адступлення яе спалілі немцы, але людзі засталіся жывымі. Усе паспелі схавацца ў бліжэйшым лесе.

— Вы вось кажаце, што стала складана, але ў параўнанні з тым часам цяперашнія праблемы — нішто, — кажа Марыя Акуліч. — Трэба было ставіць хаты, абжывацца, а да таго ж — плаціць падаткі. Прыйдуць, перапішуць свіней, парсючкоў, кожную яблыню, кожны куст — і толькі давай грошы. А дзе тыя грошы ўзяць — невядома. Мы нават вопратку і бялізну не куплялі, усё ткалі самі. Добра яшчэ, што дапамагаў старэйшы брат — ён з'ехаў і ўладкаваўся ў Сібіры. Сёння ж усё па-іншаму. У наш час хто не п'е і не лянуецца, той будзе мець заўсёды.

### ЛЕПШЫ СРОДАК АД ХВАРОБЫ

Адна з галоўных адметнасцяў Праўды — яе людзі. Яны былі «надта работнікамі», не гультаямі. Ды і мясцовая гаспадарка лічылася «моцнай».

— Я і даглядала курэй, і хадзіла на палявыя работы, і рабіла на свінарніку, і пасвіла цялят — агульны стаж назбіраўся больш за 40 гадоў, мо, гадоў восем працавала нават на пенсіі, — зазначае Марыя Акуліч. — Прычым ці не ўсё жыццё ўставала рана, бывала, што ў чатыры гадзіны ўжо было трэба знаходзіцца на сваім месцы. Адно, што неяк па маладосці крыху загуляла на вечарыне, прыйшла ў пяць, а тут і кіраўнік гаспадаркі — паглядзеў, і кажа, мне маўляў, такія работнікі, «вечарыначнікі» тут непатрэбныя. І ведаеце, стала так сорамна, што запомніла я гэты выпадак назаўсёды.

І сапраўды: падобных «інцыдэнтаў» ужо не здаралася. Затое было іншае: Марыя Акуліч мае адразу тры ордэны — Леніна, Знак Пашаны і Працоўнага Чырвонага Сцяга. А такія ўзнагароды за «проста так» не давалі.

Раней яна трымала і карову, і свіней — цяпер «здароўе не тое», засталіся толькі куры. І ўсё ж без гаспадаркі — па-ранейшаму аніяк. Нягледзячы на нібыта някепскую пенсію, па-ранейшаму саджае бульбу і агародніну, мае яблыні і нават уласны вінаград. А яшчэ на падворку абавязкова звернеш увагу на кветкі. Тут іх шмат.

— Пакуль ёсць сілы, хоць патроху, але рабіць трэба, — тлумачыць Марыя Акуліч. — А ў тым, каб сядзець без справы, нічога добрага няма. Для мяне гэта нязвычна — магчыма, у такім разе я ўжо і хадзіць не змагла б.

### ПА БУЯКІ І ЖУРАВІНЫ

Статыстыка сведчыць, што яшчэ напрыканцы мінулага дзесяцігоддзя ў Праўдзе было больш за сотню жыхароў. Цяпер «пастаяннага» насельніцтва засталося роўна 50 чалавек, прычым 30 з іх — пенсіянеры. З інфраструктуры можна назваць хіба што добрую дарогу, рэгулярныя аўтобусныя рэйсы і ўласную краму. Бліжэйшыя ФАП, Дом культуры, школа, дзіцячы садок знаходзяцца за 4 кіламетры.

І ўсё ж адназначна залічваць вёску ў катэгорыю «неперспектыўных» не варта. Пасля прыходу ў ролі інвестара сталічнага гармалзавода пачынае ажываць мясцовае сельгаспрадпрыемства, тут павышаюцца заробкі, з'яўляецца новая тэхніка. Але не менш цікава, што сама Праўда пакрысе змяняе свой «статус». Больш чым палова хат выкарыстоўваецца... пад дачы. Так, у наваколлі няма рэчкі, але яе адсутнасць «кампенсуе» вялікі, багаты на апенькі, грузды і чарніцы лес. І багатае на журавіны-буякі балота.

Зразумела, што большасць дачнікаў — гэта нашчадкі колішніх жыхароў вёскі. Аднак бывае, што дамы купляюць і людзі, якія ўжо не маюць да гэтых мясцін «прамога» дачынення. Аднак падобны «падзел» — даволі ўмоўны, прынамсі, нейкіх канфліктаў ніколі не было. І няхай сабе хтосьці ўзгадае вядомае і скажа, што «праўда ў кожнага свая». Зноў жа не верце. Бо тут для ўсіх яна — агульная.

**Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.**

*Чэрвеньскі раён.*

## Факт

### Выбух на «Беларусьфільме»

12 жніўня ў Мінску на тэрыторыі кінастудыі «Беларусьфільм» у гаражах за галоўным офісам загарэўся міні-вэн маркі «Pontiak». Гаспадар машыны пры спробе самастойна патушыць машыну атрымаў апёкі 9 % цела і знаходзіцца ў бальніцы.

### Вечны агонь... па графіку

Гомельскі гарвыканкам звярнуўся да прадпрыемства «Гомельміжрайгаз» з просьбай змяніць рэжым гарэння Вечнага агню ў двух мемарыяльных комплексах — на плошчы Працы і на Кургане Славы па Рэчыцкім шасэ з мэтай папярэджання магчымых няшчасных выпадкаў з-за анамальнай спёкі, якая назіраецца ў рэгіёне. Да асаблівага распараджэння Вечны агонь у гэтых двух месцах будзе гарэць па вызначаным графіку: у пятніцу, суботу, нядзелю — з 11.00 да 16.00; у астатнія дні агонь будзе часова выключаны.

### Інтэрпал адшуквае семярых беларусаў...

Па ініцыятыве беларускага боку ў міжнародным вышуку па лініі Інтэрпала знаходзяцца сем беларускіх грамадзян, якія абвінавачваюцца па арт. 212 «Крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі». Гэтыя даныя ў МУС назвалі, каментуючы распаўсюджаную сёння ў інтэрнэце інфармацыю пра пяцярых беларусаў, якіх быццам вышуквае Інтэрпал за злачынства ў камп'ютарнай сферы. У паведамленні ў прыватнасці гаварылася, што ўсяго ў спісе хакераў, за якімі палюе Інтэрпал, знаходзяцца сорак чалавек. Акрамя таго, журналіст працытаваў прозвішчы беларусаў з спісу: Артур Акуліч, Дзмітрый Бурак, Эрык Петэрсан, Аляксандр Рубацкі і Андрэй Яроменка...

**БЕЛТА.**

ФОКУС



# КОЛЬКІ БЕЛАРУСКІ ЖУРНАЛІСТ ЗАРАБЛЯЕ НА СКАНДАЛАХ,

## альбо Чаму не варта крыўдзіцца на рэзкія матэрыялы ў прэсе?

Апошнім часам на старонках «Звязды» з'яўляецца ўсё больш і больш яркіх матэрыялаў, якія актыўна передрукоўваюцца ў інтэрнэце. Супрацоўнікі нашай газеты рыхтуюць і скандальныя журналісцкія расследаванні, і смелыя рэцэнзіі, рэпартажы, нават мастацка-публіцыстычныя творы. Праводзяцца грамадскія абмеркаванні актуальных праблем, на іх конт выказваюцца абсалютна розныя пункты гледжання.

Вядома, што далёка не ўсе прызвычаіліся да такіх матэрыялаў, некаторым службовым асобам гэта не падабаецца: «От пісакі! Лезуць наперад бацькі ў пекла!»

Так, напрыклад, надрукаваўшы артыкул пра адкрыты гандаль наркотыкамі, я пачуў у свой адрас падобныя прэтэнзіі. Ну не прынята было раней нашым журналістам умешвацца ў такія пікантныя тэмы. Хапала і хапае іншых актуальных пытанняў — жніво, здаровы лад жыцця, палітыка і гэтак далей.

Адкуль узнікаюць непаразуменні? Сёння, на маю думку, у Беларусі адбываецца пераход на больш прафесійныя журналісцкія рэйкі. Новае пакаленне рэпарцёраў «Звязды» бярэ да ведама правераныя сусветныя тэндэнцыі падрыхтоўкі матэрыялаў. І калі артыкул не зрабіць яркім, нават у многім скандальным, то матэрыял не будзе цікавы сучаснаму чытачу. Добрая справа не будзе зроблена.

Дадам, што сёння з'явілася пераасэнсаванне мэтаў журналістыкі. Калі раней галоўным было інфармаваць і выхоўваць грамадства, то сёння яшчэ і кантраляваць сацыяльныя працэсы, а значыцца — і чыноўнікаў, якія павінны грамадству служыць.

Журналістыка — гэта праца, без якой не абысціся, разам з тым — гэта шлях выпраўлення памылак. Сваіх і чужых. Ніякі журналіст не застрахаваны ад недарэчнасцяў. І я не святы, прызнаюся вам у адным з такіх «грахоў».

Колькі гадоў таму, калі я пачынаў журналісцкую дзейнасць у адной з газет, напісаў бульварызаваны тэкст пра... беларускага Казанову. Вось гісторыя падрыхтоўкі артыкула. Мой знаёмы Сярожа (займаліся кікбоксінгам у адной зале) быў супрацоўнікам аднаго сур'ёзнага ведамства, узорнай службовай асобай. Нягледзячы на гэта, хлопец у пазапрацоўны час карыстаўся надзвычайнай папулярнасцю ў жанчын. Такой вялікай, што пісаў дзённікі пра свае пахаджэнні і вось-вось павінен быў наблізіцца да рэкорда Казановы...

У любой развітой краіне павінны быць свае цікавыя персанажы, героі, і я падрыхтаваў адпаведны бульварызаваны матэрыял пра забаўнае жыццё таварыша. І хоць на фотаздымку Сярожу пазнаць было немагчыма, а прозвішча яго не ўзгадвалася, начальнікі вылічылі нашага «казанову» і прымусілі звольніцца з працы. Атрымліваецца, што здарылася гэта з маёй журналісцкай падачы. А далей утварылася зусім камічная сітуацыя. У адну тэлефонную слухаўку мне пра звальненне распавядаў Сяргей, а ў другую — крычалі пасланнікі Андрэя Малахава з Першага канала расійскага тэлебачання: «Прыязджайце тэрмінова!» З начальствам Сяргея не дамовіліся, і давялося ехаць на шоу «Няхай кажуць» і размаўляць з Малахавым. Думалі хоць такім чынам узнавіць Сяргея на службе, усё ж хлопец не парушыў ніводнага закона. У выніку праграму Малахава паказалі на паўсвету. А вінаватым ва ўсёй гэтай гісторыі зрабілі... мяне. У фінале праграмы Алена Праснякова (маці спевака Уладзіміра Праснякова, які сустракаецца з нашай Наталляй Падольскай) грамабойна крыкнула: «Ва ўсім вінаваты журналіст. Ён выдаў смажаны факт, каб на гэтым абагаціцца!»

Дарэчы, заплацілі мне за той матэрыял пра Казанову каля 70 тысяч беларускіх рублёў (на той час каля 35 долараў ЗША). Вось і абагаціўся. Сярожа на мяне не ўкрыўдаваў, а вось сумленне не давала мне спакою працяглы час. З тае пары я даў сабе зарок — не пісаць бульварных матэрыялаў.

Што тычыцца падрыхтоўкі сур'ёзных тэкстаў, то кожнаму журналісту хочацца да тонкасцяў ведаць галіны, пра якія ён піша. Веру, што службовыя асобы з часам зразумеюць журналісцкую «спецыфіку», важнасць прафесіі і будуць ставіцца да нашай працы з ліберальнай павагай.

**Яўген ВАЛОШЫН.**

## «Біблія» для карыстальнікаў роднай мовы

**Кніга «Беларускі правапіс: апавяданні і гісторыі» выйшла ў выдавецтве «Пачатковая школа».** Яе аўтарам з'яўляецца адзін з навуковых кіраўнікоў рабочай групы па падрыхтоўцы новай рэдакцыі Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі доктар філалагічных навук, прафесар Віктар Іўчанкаў.

У манаграфіі прафесара Іўчанкава ў навукова-папулярным выкладзе падаюцца новыя правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, зацверджаныя Законам Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 года. Апавяданні суправаджаюцца гістарычнымі каментарыямі і займальным матэрыялам. Цяжкія правапісныя выпадкі разглядаюцца на прыкладах канкрэтных лінгвістычных сітуацый сучаснасці. Змяшчаецца ў кнізе таксама актуальны слоўнік, у які ўключаны цяжкія для напісання новыя словы. Кніга прызначаецца для настаўнікаў, журналістаў, рэдактараў і карэктараў, вучняў і студэнтаў, а таксама для шырокага кола карыстальнікаў роднай мовы.

Набыць кнігу можна як у кніжных крамах краіны, так і праз сістэму электроннага заказу ў інтэрнэт-краме выдавецтва www.p-shkola.by, а таксама праз сістэму выдавецтва «Кніга — поштай».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Вяртаючыся да надрукаванага

# ДАЎГАБУДУ З 80-х НА ПАРТЫЗАНСКІМ ПРАСПЕКЦЕ ПАШУКАЮЦЬ НОВАГА ЎЛАСНІКА

*Праўда, тры папярэднія спробы прадаць яго з аўкцыёна не ўдаліся*

У канцы мая ў нашай газеце быў апублікаваны артыкул «Ці дойдуць рукі да даўгабуда на Партызанскім праспекце» — будынку, які «ўпрыгожвае» праспект сваім недабудаваным і паўразбураным выглядам больш за два дзесяцігоддзі. Так, ён не мазоліць вочы, бо знаходзіцца на задворках прамзоны, аброс дрэвамі, тым не менш, стаіць акурат насупраць нядаўна ўзведзенай і ўрачыста адкрытай стэлы героям-партызанам. Будынак пачаў будавацца ў канцы 80-х, паводле падлікаў спецыялістаў, гатовы на 80 (!) працэнтаў, але больш чым за 20 гадоў яго будаўніцтва так і не здолелі скончыць. Залішне разважаць пра дарагавізну сталічнай зямлі, сотні тысяч рублёў (ці цяпер мільёнаў), закапаных у зямлю, тысячы квадратных метраў амаль гатовага комплексу, якому так і не наканавана было стаць Палацам спорту Заводскага раёна.

Фота Аляксандра КРАЎЦА.



Пабываўшы ў будынку, я яшчэ ўзіраюся ў зробленыя фотакарэспандэнтам здымкі, прыцягальныя сваім хаосам. Вось баскетбольная зала — гатовая не на 80, а на ўсе 100 працэнтаў: пафарбаваныя сцены, якія за два дзесяцігоддзі абраслі надпісамі графіцістаў, прыхільнікаў футбола і аматараў нецэнзуршчыны. Разламаныя баскетбольныя кольцы, такая ж гімнастычная сценка без перакладзін, паадчыненыя белыя рамы вокнаў. У рэшце рэшт нават жалезная вешалка для адзення — такія ў савецкія часы стаялі ва ўсіх школьных спартыўных распранальнях. Адным словам, калісьці ўсё было гатова: пераапранайся і займайся. Іншая зала, па якой цяжка цяпер і ўявіць, для якога яна віду спорту прызначалася: скручаныя і выламаныя батарэі і выпаленая вогнішчамі падчас падлеткавых забаў драўляная падлога. Чаго не хапіла тады, у канцы 80-х, каб дарабіць гэтыя 20 працэнтаў — а па вялікім рахунку абліцаваць басейн, цяпер даведацца складана. Нікому не патрэбны будынак пераходзіў з рук у рукі, пакуль не замацаваўся, хутчэй за ўсё, не без прымусу, за цяперашнім уласнікам — Упраўленне фізкультуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама. Быў нават час, зусім нядаўна, калі за будынак узяліся зноў. Справа знаходзілася на асабістым кантролі тагачаснага мэра. Тады быў распрацаваны эскізны праект аднаўленчых прац. Але над будынкам быццам бы павіс праклён — гэтак жа як у пачатку 90-х яго кінулі з-за развалу дзяржавы, так і цяпер яго «другое жыццё» спыніў фінансавы крызіс. Усе работы замарозіліся на нявызначаны, а значыць працяглы тэрмін.

Тым часам нікім не ахоўны, «незакансерваваны» будынак працягвае разбурацца. Тое, што можна было знесці, даўно знеслі — напрыклад, мармуровую плітку, адзін з самых нятанных і сёння будматэрыялаў, з падлогі ў вестыбюлі хтосьці даўно для ўласных патрэб зняў. Трэба сказаць, што падчас апошняй рэанімацыі ў будынку збіраліся размясціць сталічную дзіцяча-юнацкую спартыўную школу па водным пола. У артыкуле мы ўзгадвалі пра становішча, у якім апынуліся выхаванцы, трэнеры, і кіраўніцтва школы — апошнім часам, пасля закрыцця на капітальны рамонт басейна 14-й гімназіі, дзецям літаральна не было дзе займацца. Групы раскіданыя па трох басейнах у розных канцах горада. Праўда, паколькі воднае пола — спорт клапатлівы, над імі ўвесь час вісіць пагроза адмовы ў «вадзе». Дырэктары сярэдніх школ не надта хочуць мець лішні клопат у выглядзе груп падлеткаў з іх воднымі забавамі. Як вынік, дырэктар спартыўнай школы Аляксандр Барысенка апошнім часам штогод у канцы жніўня аказваўся ў даволі далікатнай сітуацыі — за лічаныя дні да пачатку навучальнага года яго школа мела нуль гадзін вады па ўсім горадзе. Сітуацыя ў рэшце рэшт вырашалася, дзякуючы асабістым сувязям, дамовіцца ў апошні момант удавалася.

Акрэсліўшы ў артыкуле і праблемы спартыўнай школы, і нявызначанасць з будынкам, з просьбай даць адказ мы накіравалі яго ў розныя інстанцыі — камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама (СДЮШАР-4 па водным пола падпарадкоўваецца менавіта яму), упраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама (яно з'яўляецца ўласнікам будынка па Партызанскім праспекце) камітэт па архітэктуры і горадабудаўніцтве Мінгарвыканкама (каб даведацца, як упісваецца будынак у архітэктуру сталічнага праспекта)... Адказ спачатку атрымалі толькі адзін — ад камітэта па адукацыі за подпісам старшыні Уладзіміра Шчэрбы. Прыводзім яго:

*«Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама разгледзеў пісьмо рэдакцыі газеты «Звязда» ад 26.05.2010 № 03-03/22 і паведамляе наступнае.*

*Вучэбна-трэніровачныя заняткі груп дзяржаўнай вучэбна-спартыўнай установы «Спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву № 4 па водным пола г. Мінска (далей — СДЮСШАР) на базе басейна дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 14 г. Мінска» былі спыненыя ў сувязі з капітальным рамонтам спартыўнага комплекса гімназіі на падставе рашэння адміністрацыі Заводскага раёна г. Мінска ад 30.05.2008 № 11-34. У цяперашні час рамонт аб'екта знаходзіцца ў канчатковай стадыі.*

*Увод у эксплуатацыю спартыўнага комплекса гімназіі № 14 (у тым ліку і басейна) запланаваны на 1 верасня 2010 года. Для арганізацыі вучэбна-трэніровачнага працэса СДЮШАР будзе выдаткаваны неабходны час у поўным аб'ёме».*

Застаецца спадзявацца, што ўсё адбудзецца так, як запланавана, і 1 верасня басейн адчыніцца. За дужкамі пакінем той факт, што пасля рамонту частка басейна стала менш глыбокай, што не зусім падыходзіць для заняткаў водным пола, як расказваў у размове з намі Аляксандр Барысенка. Але будзем спадзявацца, што праблема з «вадой» у выхаванцаў спартшколы часткова вырашаная.

Што да даўгабуду, то як не даходзілі да яго рукі будаўнікоў два дзесяцігоддзі, так і на паперы, складвалася ўражанне, справы нікому няма. Адказ «зацікаўленых» інстанцый мы чакалі спачатку дзесяць дзён, потым месяц... Адказаў не было. Выпадак з будынкам па Партызанскім праспекце хоць і складаны, але, хочацца верыць, не той, дзе расследаванне вымяраецца тамамі справы. У пачатку ліпеня тэлефануем у Мінгарвыканкам, дзе нам абяцаюць даць адказ у сярэдзіне месяца. Упраўленне фізічнай культуры спорту і турызму таксама збіраецца праінфармаваць нас дзесьці 17 ліпеня. Лёс нашага запыту ў камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкаму высветліць увогуле не ўдалося. У прыёмнай замест канцылярыі, якая рэгіструе карэспандэнцыю, увесь час даюць тэлефон факса, які стаіць на аўтамаце...

Паўза чыноўнікаў у паўтара месяца незразумелая, але мы зноў чакалі адказаў. Ні 15 ліпеня, ні 1 жніўня іх не было. Зноў тэлефануем, ужо не ў канцылярыю, а больш высокім чыноўнікам Мінгарвыканкама. «Ёсць інфармацыя, што ўпраўленне фізічнай культуры і спорту падрыхтавала нам адказ, ён паўмесяца ляжыць на стале...» — «Такога не можа быць. На стале паўмесяца нічога не ляжыць. Патэлефануйце заўтра, высветлім». На наступны дзень нам паведамілі: «У сувязі з вашым матэрыялам намеснік старшыні Мінгарвыканкама даручыў разабрацца і даць яму адказы камітэту па адукацыі, упраўленню па фізічнай культуры і спорту, камітэту па архітэктуры, адміністрацыі Заводскага раёна.» — «Мы атрымалі адказ толькі камітэта па адукацыі». — «Вы павінны былі атрымаць яшчэ і адказ ад упраўлення па фізічнай культуры і спорту. Але чаму вы да іх звяртаецеся? Патэлефануйце лепш у адміністрацыю Заводскага раёна — на іх тэрыторыі стаіць будынак». — «У будынка найперш ёсць уласнік — Упраўленне фізічнай культуры і спорту Мінгарвыканкама. Мы б хацелі ведаць іх пазіцыю». — «Мы разбяромся, чаму вам не даслалі адказ. Вы яго атрымаеце».

У чаканні адказу тэлефануем у адміністрацыю Заводскага раёна — хочацца пачуць усе зацікаўленыя бакі. «Афіцыйнае інтэрв'ю мы даём толькі з дазволу старшыні адміністрацыі», — адказваюць нам. Праўда, у неафіцыйнай гутарцы чыноўнік выканкама Заводскага раёна паведаміў, што іх пазіцыя — захаваць будынак. Але кампетэнцыя раённай адміністрацыі — да пэўнай мяжы, за якой заканчваецца, далей вырашае Мінгарвыканкам... А вось і доўгачаканы адказ, які прыйшоў да нас толькі ў пачатку жніўня, падрыхтаваны Упраўленнем фізічнай культуры і спорту Мінгарвыканкама за подпісам начальніка ўпраўлення Міхаіла Юспы. Ён супадае з пазіцыяй Мінгарвыканкама.

*«Упраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама сумесна з зацікаўленымі разгледзела матэрыял «Ці дойдуць рукі да даўгабуда на Партызанскім праспекце?» і паведамляе наступнае.*

*Будынак «Дом спорту» здадзены ў эксплуатацыю ў 1959 годзе.*

*У 1986 годзе спецмайстэрня Саюза архітэктараў БССР распрацавала праект рэканструкцыі гэтага будынка з частковай перапланіроўкай і прыбудовай плавальнага басейна. Будаўнічыя работы па рэканструкцыі аб'екта былі пачатыя ў 1987 годзе БУ-20 КВП «Мінскпрамбуд» (заказчык).*

*Не завершаны будаўніцтвам будынак уяўляе рознаўзроўневую ад аднаго да трох паверхаў і падвалам пабудову складанай у плане канфігурацыі, складаецца з 4 зблакіраваных паміж сабой аб'ёмаў, з утварэннем унутранага закрытага дворыка. Агульныя памеры будынка складаюць 53,2х90,43 м, плошча — 7357,9 м². Размешчана на ўчастку 2, 2266 га.*

*У 1994 годзе будаўніцтва ўсяго будынка з-за адсутнасці грашовых сродкаў было прыпынена без кансервацыі.*

*За мінулы час з моманту прыпынення будынак тройчы выстаўляўся на аўкцыёны, якія не адбыліся.*

*У адпаведнасці з даручэннем старшыні Мінгарвыканкама М.А. Ладуцькі ад 20.05.2010 аб'ект незавершанага будаўніцтвам будынка па пр. Партызанскім, 146Б рыхтуецца да выстаўлення на чарговы аўкцыён.*

Пасля прачытання пытанні, безумоўна, застаюцца. Калі праводзіліся першыя тры аўкцыёны? Будынак будзе выстаўляцца з патрабаваннем захаваць профільнасць ці не? І галоўнае, ці «захаваецца» ён да таго часу, пакуль уласнік знойдзецца? Шлях аўкцыёнаў, зразумела, пацвердзіў сваю паспяховасць у барацьбе са сталічнымі даўгабудамі, спадчынай 80-х — 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Яскравы прыклад — так званыя «вежы-трайняты» па вуліцы Ляшчынскага (яны выдатна бачныя з праспекта Прытыцкага). Пару гадоў таму ў іх з'явіўся новы ўласнік, які перапробіць колішні трынаццаціпавярховы заводскі будынак (там меркавалася размясціць канструктарскае бюро механічнага завода) у бізнэс-цэнтр «Sky Towers», будаўніцтва павінна скончыцца ўжо сёлета.

У нашым выпадку зрабіць бізнэс-цэнтр з будынка з басейнам будзе складаней. Хутчэй, прыватны фізкультурна-аздараўленчы цэнтр. Але гэта ўжо не будзе Палац спорту Заводскага раёна, дзе кожны ахвотны можа займацца спортам за невялікую плату, і там наўрад ці знойдзецца месца для дзіцячай спартыўнай школы па водным пола. Праўда, галоўнае, каб быў уласнік, які дасць будынку жыццё. Але, як вядома, тры аўкцыёны не адбыліся — ахвотных набыць будынак не знайшлося. І няма ўпэўненасці, што адбудзецца чацвёрты, пяты, дзясяты. Пакуль будынак канчаткова не разваліўся і штосьці яшчэ можна захаваць з укладзеных раней сродкаў, чаму нельга дабудаваць яго за кошт бюджэту горада? Бюджэт, зразумела, не гумавы, і спартыўны аб'ект імгненнай аддачы, як гандлёвы цэнтр, не дасць. Але здаецца, якраз такія будынкі і павінны будавацца за дзяржаўны кошт, бо іх аддача — наша з вамі здароўе.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Рэверс з сеціва

## ПРАЗ 10-15 ГАДОЎ ДОБРЫЯ СКУТАРЫ ВЫМРУЦЬ ЯК МАМАНТЫ?

**(11 жніўня 2010 года)**

*Мінскія скутарысты супраць павышэння пошлін на ўвоз мотатэхнікі*

**Калі яшчэ 15 гадоў таму скутарысты былі рэдкасцю, то сёння толькі ў Мінску армія прыхільнікаў скутараў налічвае ўжо чатыры з паловай тысячы чалавек. Толькі пачалі беларусы разумець, што на цёплы перыяд двухколавыя транспартныя сродкі — цудоўная альтэрнатыва аўтамабілям, як раптам паставілі тлусты крыж на ўвозе мотатэхнікі ў нашу краіну...**

**Надзея ДРЫЛА.**

@

Такое ўражанне што закон выйшаў для паважанага апанента і яго знаёмых (вы не збіраецеся набываць і добра), а пра жыццё цэлай рэспублікі можна і не пытаць!? З новага года правы ўвядуцца, у мяне асабіста яны 15 гадоў, а забабоны аб няведанні правілаў дарожнага руху ўладальнікамі двухколавай тэхнікі годныя пячорнага чалавека. Так, не спрачаюся, як і сярод аўтамабілістаў ёсць працэнт, які выклікае абурэнне манерай язды, аднак больш увагі трэба надаць перагляду ПДР для двухколавай тэхнікі (такіх, напрыклад, як рух толькі ў першай паласе). Вы самі спрабавалі ездзіць па паласе смецця, раскатанай да ям аўтобусамі і тралейбусамі, і ў палове выпадкаў застаўленай стаячымі машынамі (з немалым каэфіцыентам верагоднасці раптоўнага адчынення дзвярэй)? На мой погляд, падобныя рэплікі чыноўнікаў, як і падобныя законы, ставяць пад сумнеў клопат дзяржавы аб народзе. Надышоў час, калі простае насельніцтва змагло сабе дазволіць купіць нядорага выдатны, эканамічны і досыць хуткі від транспарту, дык не вам. Жыць трэба па сродках, а не набіраць крэдыты (адмаўляючыся ад КАСКА і гарантый), каб толькі купіць машыну. З нашай сярэдняй зарплатай 700 000—1 200 000 я не хачу ўсю зарплату аддаваць на бензін, тым больш паўгода працаваць з зубамі на паліцы для таго, каб заплаціць за размытнёўку!!!

**Валянцін.**

@

Апаненту хацелася б адказаць, што, вядома, кожны мог зайсці на сайт і азнаёміцца, толькі гэта нагадвае гісторыю з кнігі «Аўтастопам па Галактыцы», дзе іншапланецяне прыляцелі знішчаць Зямлю, каб расчысціць месца для свайго нейкага будаўніцтва, і заявілі, што ніякія пратэсты не прымаюцца, паколькі копія плана гэтага будаўніцтва вісела ў іх у галактычным цэнтры цэлы месяц і кожны ахвотны мог азнаёміцца. З гэтымі словамі яны Зямлю і знішчылі.

Да ведама: не зарэгістраваныя ў ДАІ толькі скутары з аб'ёмам рухавіка меней за 50 см3, аднак новыя правілы ўвозу закранаюць не толькі іх, а таксама і «вялікія» скутары, якія патрабуюць правы/рэгістрацыю, і наогул УСЮ мотатэхніку. Вядома, апанент сам не мае скутара, і яго знаёмыя таксама, і наогул не цікавяцца падобнымі рэчамі, а такім чынам ім няма ніякай справы да праблем «людцаў» на двух колах. Сапраўды, навошта беларусам перасаджвацца на экалагічна чысцейшы і значна больш эканамічны транспарт? І Еўропа, якая перасаджваецца з аўто на скутары і ровары нам мабыць таксама не прыклад. Рост аўтамабіляў у сталіцы і заторы на дарогах, гэта таксама не тыя праблемы, якія здаюцца нашым чыноўнікам істотнымі. Бо без скутара можна абысціся. Можа быць апанента не хвалююць падобныя праблемы, у яго напэўна ёсць службовы транспарт. І праблем з бензінам, кошты на які толькі растуць, таксама не ўзнікае. Але не варта забываць, што толькі ў Мінску больш за 4000 скутарыстаў, не лічачы матацыклістаў. І гэта таксама людзі, грамадзяне гэтай краіны, пра якіх можна было б і падумаць і ўспомніць, перш чым адным раўнадушным росчыркам ставіць на іх крыж.

**Міхась.**

@

Я супраць падвышэння ў некалькі разоў мытных плацяжоў на скутар, гэта парушэнне права свабоднага выбару транспартнага сродку. Тыя апраўданні інтарэсаў, бізнэс-структур, якія кантралююць рынак аўтамотатэхнікі нікчэмныя. Нагадаю адзін факт: у Правілах дарожнага руху РБ 1996 года запісана, што транспартныя сродкі да 50 кубікаў падлягаюць дзяржрэгістрацыі, а таксама ўводзяцца правы, якія адпавядаюць катэгорыі, таму заявы аб тым, што няма правоў на кіраванне і рэгістрацыі транспартных сродкаў, катэгорыі L1 некарэктныя, а тое, што «няхай да нас ідуць», абсалютна наіўна, гэта беларускі бок павінен ісці да вытворцаў якаснай мотатэхнікі і дамаўляцца аб вытворчасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пры ўмове стварэння фактычна нацыянальнай гандлёвай, сэрвіснай сеткі, накіраванай на станоўчы гандлёвы баланс, а не сляпое капіраванне расійскага вопыту па зборцы кітайскай мотатэхнікі нізкай якасці, бо досыць паглядзець водгукі на такую тэхніку ў інтэрнэце.

**z-Hunter.**

@

Адкуль гэтыя працэнты!!! Чаму такія лічбы? Хто іх прыдумаў?

Грамадзяне Расіі плацяць занадта мала падаткаў пры набыцці ў Беларусі? А правы саміх беларусаў можна кудынебудзь засунуць? Ужо відавочна не самім людзям гэта было трэба. Абарона расійскага аўтапрама за наш рахунак?

**нета.**

@

Наогул той жа кітайскі скутар і так каштуе нятанна (не кажучы ўжо аб новых японцах і еўрапейцах) і купляюць скутары з большага для эканоміі грошай на тым жа бензіне, а гэтак жа для зручнасці перамяшчэння. Для кагосьці гэта адзіны магчымы від транспарту (па фінансавых меркаваннях альбо па здароўі). Вельмі здзіўляе, як чыноўнікі прыдумалі зрабіць на дадзеную катэгорыю тавараў мытны падатак цэлых 44 %. Або скутар ужо лічаць раскошай?

**Вячаслаў (Forestrash).**

## СПАЖЫЎЦЫ СТАЛІ ЧАСЦЕЙ ЗВЯРТАЦЦА ПА АБАРОНУ СВАІХ ПРАВОЎ

**(11 жніўня 2010 года)**

**Узрасла колькасць зваротаў грамадзян на недабраякасныя тавары і паслугі. Якасцю абутку не задаволены 56 % апытаных, швейных і трыкатажных вырабаў — 31 %, тэлефонных апаратаў — 30 %, медыцынскіх паслуг — 40 %, ЖКГ — 38 %, транспартных паслуг — 20 %.**

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

@

Абарона правоў спажыўца кульгала на абедзве нагі і пры Саветах, аднак, справядлівасці дзеля, варта прызнаць, што ў тыя часы пакупнік мог у 90 працэнтах выпадкаў абараніць свае правы, асабліва ў сферы гандлю. Сёння ж — працэнт гэты нават цяжка назваць. Вось нават галоўны абаронца, назваўшы дзясяткі лічбаў, не назвала самай галоўнай — колькім людзям яны дапамаглі дамагчыся справядлівасці. А таму дадзенае інтэрв'ю мае нулявы ККД. Са свайго вопыту скажу. Я двойчы сур'ёзна цапаўся з прадаўцамі, якія прадалі мне тавар бракаваны. Прычым у кожным з выпадкаў мая праўда не патрабавала экспертызы. Гомельскія абаронцы правоў спажыўца фармальна мне дапамагалі ў змаганні з прадаўцамі, але толькі фармальна. Рэальнай вагі яны не маюць. Буйны таварапрадавец чхаць хацеў на гэтую грамадскую арганізацыю. Да ўсяго ў прадаўцоў надзейныя дахі, на іх працуюць і сэрвіс-цэнтры. Карацей, у адным з двух выпадкаў (слоік фарбы) я дамогся звароту грошай, а ў другім — 450-доларавы фотаапарат з заводскім бракам — НІЧОГА НЕ ЗМОГ ДАКАЗАЦЬ ні прадаўцу, ні сэрвіс-прыёмшчыку... Хоць было заключэнне-рэкамендацыя гаспадару крамы ад арганізацыі па абароне правоў спажыўцоў замяніць бракаваны тавар. Мяне нахабным чынам пракінулі. Загмаг не ўзяў у мяне ні заявы, ні тавару на экспертызу... Аналагічна паступілі і ў сэрвіс-цэнтры. Там сфоткалі знешні дэфект майго фотаапарата і па факсе (камп'ютары) скінулі малюначак у Маскву, у галаўны сэрвіс. Масква адказала (я выпадкова прачытаў іх зваротнае пасланне майстру сэрвіс-цэнтра): «...Калі няма заключэння экспертаў, зрабіце ўсё, каб пераканаць спажыўца ў яго віне. Калі заключэнне ёсць, то скажыце, што патрабуецца экспертнае заключэнне нашай фірмы».

**Мікалай Бандзюк-Банцэвіч.**

## ЯК ПРАЖЫЦЬ НА ЗАРПЛАТУ МАЛАДОГА СПЕЦЫЯЛІСТА?

*(Рэальныя гісторыі з жыцця)*

**(10 жніўня 2010 года)**

**У мяне вельмі шмат сяброў — маладых спецыялістаў. Яны настаўнікі і журналісты, мадэльеры-дызайнеры і навуковыя супрацоўнікі разнастайных музеяў... Яны поўныя працоўнага імпэту і жадання змяніць гэты свет да лепшага... Але ёсць у іх адна перашкода — сціплая зарплата. Яна і высакароднае жаданне не падтрымлівае, і імпэт бязлітасна знішчае...**

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

@

Я не магу зразумець чаму... не шануюцца людзі з вышэйшай адукацыяй. Усе мае знаёмыя дапамагаюць сваім дзецям, якія скончылі ВНУ. Навошта тады 5 гадоў вучыцца, каб потым атрымліваць грашы? Няўжо сітуацыя не зменіцца? Вядома, хочацца верыць у лепшае.

**Чалавек.**

@

Сама была студэнткай, жыла ў інтэрнаце. За гады вучобы зарабіла хваробы кішачна-страўнікавай сістэмы і інш. Цяперашняй зарплаты не хапае на лекі, каб залячыць балячкі. Калі б вярнуць назад, пайшла б лепш адразу працаваць, напрыклад, кандуктарам, атрымлівала б зарплату ў 3 разу большую, адпрацавала змену і вольная, без усякага трапання нерваў. Мусіць, так і зраблю, толькі трэба папраўіць здароўе.

**Былы студэнт.**

@

А вы дзівіцеся, чаму дзяўчаты шукаюць фундатараў або становяцца...

**Андрэй.**

@

Я н-е р-а-з-у-м-е-ю. Нейкі жах тут апісаны. Дзе вы знайшлі такія зарплаты? Усякае, вядома, бывае, але калі чалавек хоча працаваць, ён знойдзе працу. ПРЭСТЫЖНУЮ і ВЫСОКААПЛАТНУЮ. Або вы думаеце, што калі атрымалі вышэйшую адукацыю, дзяржава вам абавязана падаць добрую працу на сподачку? Ад абурэння проста бракуе слоў.

Дзясяткі маіх аднакласнікаў і знаёмых працуюць у розных гарадах нашай краіны і жывуць прыпяваючы. А вельмі многія, у тым ліку і я, і з няскончанай вышэйшай атрымліваюць значна большыя грошы, чым паказаныя тут. Проста не лянуйцеся, паважаныя маладыя спецыялісты.)))))))

**Дар'я.**




## НА РОЎНЫМ МЕСЦЫ

...Адзін з «Верасоўцаў» Генадзь Старыкаў распавядаў, як іх ансамбль быў у Парыжы, як ён асабіста штосьці ўбачыў на другім баку вуліцы і рвануў туды — напрасткі. Потым ужо агледзеўся, што ў недазволеным месцы. Аднак, што здзівіла, паліцэйскага свісту не пачуў. Больш за тое, дзясяткі машын, прапускаючы яго, замаруджвалі ход, спыняліся, і ніхто з кіроўцаў нават не думаў лаяцца, абзываць яго казлом ці пытаць, куды ён прэцца?..

Гэты аповед нагадаў мне расказ майго школьнага сябра. Ён у сярэдзіне тых жа 80-х лятаў на заробкі ў Сібір, працаваў там вахтавым метадам.

Дык вось, аднойчы, у чарговы раз вяртаецца ён дамоў — у Беларусь, вяртаецца, як на грэх, галодны-галодны... Але ж, думае, не ў пустыні, не ў лесе — з грашыма, у горадзе, значыць, не прападу. Вакол сябе азіраецца і сапраўды — побач шыльда вісіць: «Сталовая». Яны з прыяцелем туды — не марудзячы. А каб бліжэй было — праз вуліцу, напрасткі. Тым больш што і машын няшмат, думалі — пранясе.

Не пранесла: не паспелі ля той сталоўкі на тратуар ступіць — міліцэйскі свісток. І сам вартавы правапарадку, як з-пад зямлі: з вас, маўляў, штраф, тры рублі — за парушэнне правілаў дарожнага руху.

Хлопцы тутэйшыя, нашы — пярэчыць не прывыклі (а тым больш, ведаючы, што вінаватыя). Ды і рублёў тых не вельмі шкада: ім добра плацілі, да таго ж пазаўчора — усё пры сабе, жонкам не давезлі яшчэ. Адзінае — купюры буйныя...

То выцягнуў мой сябар найменшую — 25-рублёвую (штраф тады бралі на месцы), падае міліцыянту. А ў таго, як на ліха, няма чым рэшту даць: не паспеў яшчэ грошай «назбіраць». У выніку на роўным месцы праблема — разысціся не могуць.

Мой сябар тады вазьмі ды ляпні: «А давай я (кажа міліцыянеру) на ўсю рэшту буду праз вуліцу хадзіць — туды-сюды, туды-сюды... Ты будзеш свістаць, а мой прыяцель — «ходкі» лічыць...»

Аднак службоўцу гэта прапанова не прывабіла: адпусціў ён іх — што называецца, з мірам...

Ужо ў сталоўцы хлопцам расказалі, што ў яго калег тут улюбёнае месца — толькі штрафуй: на тым баку вуліцы — аўтобусны прыпынак, на гэтым — пункт харчавання, людзі так і прастуюць...

Такі вось кантраст з Парыжам. Быў... Ці застаўся, дакладна сказаць не магу, але ж мяркую, што цяпер паток аўтамабіляў у іх не меншы, чым у нас, і праз вуліцу ўжо не пабяжыш — жыццё даражэйшае.

**Валерый ГАЎРЫШ,**
*г. Чавусы.*

## ДВОЕ НА СКРЫЖАЛЯХ ЧАСУ

Пра свае «ўніверсітэты» ў 70-х гадах мінулага стагоддзя мне распавёў слынны ганчар Іван Маўчановіч.

Значыць, падчас вайны ў нашым мястэчку Івянец стаяў нямецкі гарнізон, у навакольных вёсках туляліся групоўкі польскіх акаўцаў, у блізкай Налібоцкай пушчы ўладарылі савецкія партызаны...

Гарэзлівы, дасціпны хлопчык Янак хадзіў у школу, вучыўся лёгка, і ўсё жыццё сваё помніў, прынамсі, як вучні і настаўнікі былі застрашаны візітам інспектара з Наваградка Барыса Кіта, і якім жа добрым і простым чалавекам ён аказаўся!..

А яшчэ адным выхавальнікам неспадзеўкі стаў для хлапчука... немец, як празвалі яго местачкоўцы, добры Ганс. Бо ён і сапраўды па-людску ставіўся да людзей, стараўся разумець іх мову і нават размаўляць.

Дык вось Ганс той, лічы, штодзень нясе вахту ля касцёла святога Міхаіла. Янак праходзіць міма — час ад часу збірае на вуліцы недапалкі, вучыцца смаліць.

Немец толькі ўбачыў гэта, паклікаў хлопчыка да сябе, выкінуў яго самакрутку і даў яму сапраўдную цыгарэту. Нават сам прыпаліў яе — ад запальнічкі. Янак рады быў, бо засмаліў жа, як дарослы: зацягнуўся раз, другі і хацеў ужо прытушыць «гасцінец» — досыць.

— Не, — сказаў немец, зноў прыпаліў недакурак...

А Янак ужо закашляўся, у вачах пацямнела...

— Добры ж Ганс не, каб пашкадаваць яго! Наадварот: узяў хлапчука за плечы, павярнуўся да сябе спінай і даў такога выспятка...

Янку дужа крыўдна было, і наступнай раніцай ён хацеў ужо пайсці ў абход. Ганс паклікаў:

— Ком, ком (падыдзі, маўляў. На).

У руках яго была... вялікая плітка шакаладу. Немец аддаў яе хлопчыку, ласкава пагладзіў па віхрастай чупрыне, сказаў:

— У мяне сынок такі, як ты. У далёкай Баварыі...

І потым з сумам дадаў:

— І каму патрэбная гэта вайна?

З таго часу яны як бы пасябравалі: Ганс частаваў хлапчука нейкімі прысмакамі, Янак, дзякуючы атрыманаму ўроку, адрокся ад курыва...

Ранкам 19 чэрвеня 43-га значныя сілы акаўцаў атакавалі Івянец. Нямецкі гарнізон быў разгромлены.

Калі стрэлы сціхлі, у вербалоззі ля кляштара Янка ўбачыў Ганса, таемнымі сцежкамі перавёў яго ў закінутую ганчарню, прынёс туды хлеб і да хлеба...

Больш яны ніколі не сустракаліся, але Янак быў усцешаны тым, што ў ліхую часіну хоць крыху дапамог аднаму са сваіх настаўнікаў.

Той, па чутках, ваяваў у антыфашысцкіх фарміраваннях, вызваляў Еўропу ад карычневай чумы.

**Алег РАМАНОЎСКІ,**
*г.п. Івянец, Валожынскі раён.*

## УСЁ ПА ФЭН-ШУЮ

Было гэта гадоў пятнаццаць таму. Да адных людзей з Поўначы прыехаў зяць — здабытчык нафты. А яны, як вядома, могуць сабе дазволіць і ў цёплым моры ўволю паплаваць, і ў сваіх пагасцяваць. Прычым — з размахам.

Гэты, прынамсі, рашыў сябрукоў сабраць — на шашлыкі, тут жа, у цесцевым садзе. Класнае месца! Адзінае — прыбіральня тырчыць, як бяльмо на воку...

— Дзед, давай перанясу, — кажа зяць, — а то не па фэн-шую стаіць, усю карціну псуе! Да таго ж заблізка ад хаты — санітарныя нормы парушаны.

Дзед яму:

— Мне твае нормы і фэн-шуй да фэн-шую... А што там яма глыбокая — гэта важна!

— Дык зробім мы яшчэ адну, да скону бяды не будзе! — госць абяцае. Бо ён жа дасведчаны: на буравых не такія ямы капаць даводзіцца (хоць і машынамі).

— Калі так, давай, — згаджаецца цесць.

І вяскоўцы ім насустрач пайшлі:

— Спраў — на дзве пляшкі беленькай, — тому зяцю сказалі. — Ды на «Мальбара»...

Карацей, дзён праз колькі прывёз госць два калодзежныя кольцы, з хлопцамі ўкапаў: гадзіна-другая працы — і дзедава збудаванне ўжо на новым месцы стаіць (па фэн-шую), нават яму старую прысыпалі. Заставалася што? Ды драбяза, — аднаго з работнікаў ужо можна было ў краму пасылаць.

Той адна нага там, другая...

Колькі там часу прайшло, чуюць мужыкі — галоўнае побач — адборны мат і крык: «Памажыце!..».

Бегчы на яго не трэба было — вось яна тая самая старая яміна. У ёй — па грудзі, лічы — стаяў «ганец». Але ж торбу з пакупкамі не спэцкаў, збярог — над галавою трымаў.

Ён, як высветлілася, напрасткі пабег, каб хутчэй было, а зямелькі ж у яму няшмат накідалі, і яна неўляжаная...

Хлопцы схапілі спачатку торбу, потым дасталі і ганца — босага (боты, мусіць, завялікія былі — засмактала)...

Мылі небараку паводдаль, распрануўшы дагала (вопратку ўсю закапалі). Мылі спачатку вадой са шланга, потым, для прафілактыкі, яшчэ і гарэлкай, халера з ёй. Апранулі потым у новенькі касцюм нафтавіка (раней падораны цесцю)...

Пасля гэтага селі-такі замочваць аб'ект, але неяк без імпэту... Да трэцяй чаркі. Потым ён аднекуль з'явіўся.

Што цікава, з «ганца», які ва ўсім новым выглядаў навагодняю ёлкай, пры гэтым не кпілі, не смяяліся. Мо таму што разумелі — на яго месцы мог аказацца любы.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## КАМЕРА ДЛЯ ВОЖЫКАЎ

У савецкія часы (ды, відаць, і цяпер?) студэнты ездзілі з сумкамі: АД бацькоў — з поўнымі, непад'ёмнымі (з тушонкай, варэннем, салам...), ДА бацькоў — з пустымі. Як адзін першакурснік...

То ехаў ён, значыць, дамоў. У Лунінцы перасадка была, але не адразу — счакаўшы. Таму хлапец пакінуў свой пусты чамадан у камеры захоўвання і пайшоў сабе ў горад — пагуляць па вуліцах, паглядзець, мо нават у кіно схадзіць.

Але ж час быў і назад вяртацца. Шыбуе ён, значыць, да той камеры, да сваёй ячэйкі, набірае шыфр, а дзверцы «заклініла» ці што: не адчыняюцца — хоць ты плач. І так ён ля іх і гэтак... Што рабіць? Пайшоў шукаць дзяжурнага па вакзале — нехта ж павінен дапамагчы?

Той не, не адмовіў, але ж для парадку пачаў распытваць:

— А што ты туды палажыў?

— Чамадан.

— А што ў чамадане?

— Тры вожыкі.

— ?.. А чаго ты іх возіш?

— Гляджу... Дзядзечка, адчыніце хутчэй, я на цягнік спазнюся.

— ...Дык яны ж падохлі.

— Хто?

— Ну вожыкі.

— Дык яны і былі... Ну таго...

— А чаго тады іх вазіць? І глядзець?.. Не, хлопча, ты штось «цямніш», недагаворваеш... Што яшчэ ў чамадане?

— Кракадзіл...

Толькі тут да дзяжурнага стала даходзіць: «Вожык» і «Кракадзіл» — гэта ж часопісы! ...Яны, сатырычныя, выходзілі некалі ці не мільённымі тыражамі, на слыху былі.

Цяпер ды маладому дзяжурнаму гэтыя назвы нічога, відаць, не сказалі б: змяніліся часы, змяніліся і людзі.

**Галіна БАБАРЫКА,**
*в. Мачуль, Столінскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж...*** *У апошняй падборцы многім так спадабалася прыпіска...*

*Тут мо дарэчы яшчэ адна? Кажуць, у рэдакцыі «Вожыка» некалі працаваў Зуб — прозвішча такое ў чалавека было... У сувязі з чым нехта з гумарыстаў выдаў:*

*Мой браце «Вожык»,*
*Мой ты любы,*
*Хоць ты і з Зубам,*
*Ды бяззубы.*

*Так гэта ці не, сцвярджаць не бяруся. Трэба, як таму першакурсніку, «паглядзець».*

